МИНИСТЕРСТВО ОБРАЗОВАНИЯ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

БАРАНОВИЧСКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ ВЫСШИЙ
ПЕДАГОГИЧЕСКИЙ КОЛЛЕДЖ

Репозиторий БарГУ

# МЕЖВУЗОВСКИЙ СБОРНИК

# НАУЧНЫХ СТАТЕЙ
# МОЛОДЫХ ИССЛЕДОВАТЕЛЕЙ

Барановичи
2004

УДК 082
ББК 94
С23

**Рецензенты:** доктор педагогических наук, профессор, действительный член БелАО, заслуженный деятель науки Республики Беларусь А.П. Сманцер; доктор психологических наук, доцент В.А. Янчук

Рекомендовано к изданию Советом БГВПК, протокол № 10 от 26 апреля 2004 года.

**Межвузовский сборник** научных статей молодых
С23 исследователей / Под науч. ред. Л.Ф. Мирзаяновой.– Барановичи: Баранович. гос. высш. пед. колледж, 2004. – 198 с.

ISBN 985-6616-33-8.

В сборнике представлены научные работы преподавателей, аспирантов и соискателей вузов Республики Беларусь, а также студентов, членов Научного студенческого общества Барановичского государственного высшего педагогического колледжа.

**УДК 082**
**ББК 94**

**ISBN 985-6616-33-8**

© Барановичский государственный высший педагогический колледж, 2004

Репозиторий БарГУ

# «ПРЭЗЕНТАЦЫЯ СВЕТУ» ЯК ЭЛЕМЕНТ КАМПЕТЭНТНАСНАГА ПАДЫХОДУ Ў НАВУЧАННІ

**А.І. Белая**, кандыдат педагагічных навук, дацэнт, заг. кафедры гуманітарных дысцыплін Баранавіцкага дзяржаўнага вышэйшага педагагічнага каледжа

**А.А. Палідавец**, студэнтка ІІ курса факультэта замежных моў Баранавіцкага дзяржаўнага вышэйшага педагагічнага каледжа

Сучасная парадыгма адукацыі з'арыентавана не столькі на веды, уменні, навыкі, колькі на набыццё вучнем асобасных адукацыйных сэнсаў, што азначае вылучэнне адукацыйных аб'ектаў, адносна якіх вучань самавызначаецца, здабывае веды, знаёміцца з адпаведнымі культурна-гістарычнымі дасягненнямі свайго народа і чалавецтва. Асобасна-арыентаваная адукацыя мае на ўвазе выяўленне і развіццё ў вучня асобаснага сэнсу адносна аб'ектаў і ведаў аб іх. Сэнсаўтваральныя матывы адукацыі ўплываюць на светапогляд і жыццёвыя пазіцыі вучня. Згодна з высновамі А.В. Хутарскога [2], для працэсу пошуку



Репозиторий БарГУ

і набыцця сэнсаў у ходзе навучання ўласцівы наступныя этапы:

– пазіцыя і адпаведная дзейнасць адносна фундаментальных дасягненняў чалавецтва, звязаных з вывучаемымі аб'ектамі (адносна да агульна-культурных ведаў і сацыяльнага вопыту);

– самаўсведамленне вучнем асабістага вопыту, ведаў і каштоўнасных адносін, якія выявіліся ў працэсе пазнання адукацыйных аб'ектаў і агульна-культурных звестак аб іх (рэфлексіўна «знятыя» вынікі пазнання і творчасці);

– асобасная творчасць вучня адносна вывучаемых аб'ектаў (адукацыйная прадукцыя вучня як асобасны змест яго адукацыі).

Якасці вучня, якія развіваюцца ў ходзе рэалізацыі комплексу пералічаных элементаў яго адукацыйнай дзейнасці, ёсць адукацыйныя кампетэнцыі. Яны звязваюць у адзінае цэлае асобасны і сацыяльны сэнс адукацыі. Авалоданне кампетэнцыямі дае магчымасць адэкватна дзейнічаць у працэсе рашэння канкрэтных задач ці праблемных сітуацый. У межах адзінага артыкула звернемся да такіх параметраў кампетэнцый, як:

– метапрадметнасць (прысутнасць праз асобныя элементы або цэласна ў розных адукацыйных галінах);

– шматфункцыянальнасць (прадстаўленне вучню магчымасці вырашаць праблемы з розных сфер жыцця).

Ключавыя кампетэнцыі заўжды адносяцца да рэальных і сацыяльна значымых аб'ектаў рэчаіснасці. Праілюструем акцэнтаваны намі падыход на прыкладзе набыцця вопыту адукацыйнай дзейнасці

Рэпазіторый БарГУ

і эмацыянальна-каштоўнасных адносін, што датычыць такога аб'екта матэрыяльнай і духоўнай культуры, як пчала. Нашым сучаснікам уласціва утылітарнае ўспрыманне дадзенага аб'екта (пчала дае чалавеку мёд), але разам з тым, гэтая істота ўяўляе найвялікшую загадку сярод усіх жывых істот, што насяляюць Зямлю. Яна з'явілася на свет нашмат раней чалавека, і зямное яе існаванне налічвае больш за 80 мільёнаў гадоў. Пчала шматразова ўпамінаецца ў Бібліі; вусныя паданні, старажытныя міфы, іерогліфы, высечаныя на каменных плітах, пісьмёны на пергаменце і паперы ўваскрашаюць у нашай памяці тыя часы, калі пчалу высока шанавалі і абагаўлялі. Вобраз пчалы ў сусветнай матэрыяльнай і духоўнай культуры мае як рэалістычны, так і сімвалічны змест. Даніну ўвагі яму аддалі мастакі, пісьменнікі, філосафы. Разглядаць феномен пчалы можна ў экалагічным, фізіялагічным, псіхасацыяльным [1] і культуралагічным аспектах. Такое міжпрадметнае даследаванне спрыяе ўзнаўленню цэласнай карціны рэчаіснасці і дазваляе выявіць ролю пчалы нават у такім глабальным вымярэнні, як выжыванне сённяшняй цывілізацыі [1].

Агульнакультурны і нацыянальна-культурны змест згаданага аб'екта знаходзіцца ў дыялектычнай узаемасувязі. Яго спасціжэнню спрыяе такі прыём, як «прэзентацыя свету» [3]. Ён якраз і накіраваны на перавод прадметнага ўспрымання свету ў яго каштоўнаснае ўспрыманне, што з'яўляецца падмуркам асобасна-арыентаванай адукацыі.

Пераўтварэнне характару ўспрымання адбываецца ў працэсе сацыялізацыі асобы, яе духоўнага развіцця,



Репозиторий БарГУ

інтэлектуальнага і эмацыянальнага ўзбагачэння. У самых агульных рысах прыём рэалізуецца наступным чынам: прад'яўляецца пэўны аб'ект (у нашым выпадку – гэта пчала), прапануецца апісаць яго ролю ў жыцці аднаго чалавека і ўсяго чалавецтва, вызначыць, якія адносіны аб'ект ўтрымлівае ў сабе, калі ўключаны ў штодзённы побыт. Такім чынам, выяўляецца духоўная каштоўнасць матэрыяльнай рэчы, развіваецца здольнасць школьніка да творчага ўяўлення і адухаўлення, з'яўляецца магчымасць вызваліцца ад прадметна-рэчыўнай залежнасці.

Безумоўна, гэты працэс не аднамомантны. Вось як ён уяўляецца нам у кантэксце вывучэння дысцыплін гуманітарнага цыклу: выяўленне месца і ролі пчалы ў матэрыяльнай культуры беларусаў (з далучэннем прыродазнаўчых і этнаграфічных крыніц); філасофскае абгрунтаванне феномена; дыялектыка якасцей пчалы і пчалінага «соцыуму», з аднаго боку, і менталітэту беларусаў, характарыстык іх сацыякультурнага быцця, з другога); сімвалічны змест вобраза пчалы (пачынаючы ад скарынінскай «Прадмовы»); культ пчалы ў вуснай народнай творчасці і творах беларускіх паэтаў і пісьменнікаў (паэмы Я. Коласа «Новая зямля», Р. Барадуліна «Самота паломніцтва», яго зборніку «Свята пчалы» і інш.). З даследаваннем дадзенага аб'екта могуць быць звязаны і больш прыватныя аспекты, напрыклад, «пчаліная» лексіка ў творах мастацкай літаратуры і да т.п. Па меры набыцця школьнікамі адукацыйнага, сацыяльнага, асобаснага вопыту формы «прэзентацыі» могуць і павінны ўскладняцца, усё больш скіроўваючыся ў рэчышча самастойнай даследчай і творчай

Рэпазіторый БарГУ

дзейнасці адносна акрэсленага феномена, што, на нашу думку, будзе спрыяць аваладанню вучнямі адукацыйнымі і сацыяльнымі кампетэнцыямі.

### Літаратура

1. Хуторской А.В. Ключевые компетенции как компонент личностно-ориентированной парадигмы образования // Народное образование.– 2003.– № 2.– С. 58–64.

2. Вераб'ёў П. Знікнуць пчолы – загінуць людзі // Літаратура і мастацтва.– 2001.– № 18.– С. 2–15.

3. Шуркова И.Е. Собрание пестрых дел.– М.: «Новая школа», 1994.– 215 с.

Репозиторий БарГУ